# Партытура для рэжысёра

**Працягваем "чытаць" дапаможнік выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алены Макаравай, Святланы Майсейчук і Ірыны Смарговіч "Тэхналогіі культурна-дасугавай дзейнасці". Нагадваем, што дапаможнік прызначаны для работнікаў культуры.**

Яўген РАГІН

Сацыякультурныя рэабілітацыйныя тэхналогіі (традыцыйныя): бібліятэрапія, арт-тэрапія, музыкатэрапія, данстэрапія, тэатратэрапія, глінатэрапія, кінатэрапія, музеетэрапія...

**Праектаванне — спецыфічная тэхналогія: канструктыўная творчая дзейнасць, сутнасць якой заключаецца ў аналізе праблем і выяўленні прычын іх з'яўлення, выпрацоўцы мэтаў і задач, што характарызуюць пажаданы стан аб'екта, распрацоўку шляхоў і сродкаў дасягнення мэты; з другога боку — гэта мэтанакіравана арганізаваны працэс сацыякультурнай камунікацыі суб'ектаў, арыентаваны на сумеснае канструяванне спосабаў і ўзораў рашэння значных для асобы і грамадства праблем.**

Сцэнарый культурна-дасугавай праграмы — гэта падрабязная літаратурная распрацоўка драматургічнай дзеі, прызначанай для пастаноўкі. У сцэнарыі абавязкова павінны быць: адзіная драматургічная дзея, сюжэтны ход і падзейны шэраг, канфлікт як "дыялог дзей", жорсткая кампазіцыйная структура, жанравая разнастайнасць.

**Такі сцэнарый пішацца не для чытача, а для рэжысёра.**

Драматургія культурна-дасугавых праграм мае свае колькасныя і якасныя паказчыкі: Актуальнасць з пазіцый бягучых грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, і сацыяльна-культурных задач, якія стаяць перад грамадствам; пераемнасць і паслядоўнасць у падрыхтоўцы і правядзенні; разнастайнасць форм.

**Сцэнарны план — структурна-драматургічная аснова, накід кампазіцыйнай пабудовы сцэнарыя з аўтарскім вызначэннем ідэйна-тэматычнай задумы і характарыстыкай аўдыторыі. Гэта — агульнае бачанне будучай дасугавай праграмы, яе асноўных эпізодаў, нумароў унутры эпізоду і характару іх чаргавання.**

Літаратурны сцэнарый — падрабязная літаратурная распрацоўка ідэйна-тэматычнай задумы з поўным тэкстам, апісаннем месца і часу дзеі, сцэнаграфіі, музычнага і светлавога афармлення, сюжэту харэаграфічных і пластычных кампазіцый, іншых сродкаў мастацкай выразнасці.

**Мантажны ліст — рэжысёрская партытура, дзе дакладна распісаны ўсе кампаненты эпізодаў і нумароў, выразных сродкаў іх забеспячэння.**

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ